ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама

______________І.Г.Лашкевіч
______________ 2023 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)” (комплексная работа)

Дата правядзення: 29 сакавіка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 11.40 (45 хвілін, 10 хвілін перапынак, 45 хвілін).

### IVклас

1. Прачытай тэкст.

Ваша здароўе

Здароўе – самая вялікая каштоўнасць чалавека. Дрэннае здароўе, хваробы служаць прычынай адставання ў росце, дрэннай паспяховасці, дрэннага настрою. На ўсё жыццё вам даецца толькі адзін арганізм. Калі вы нядбайна ставіцеся да рэчаў, іх можна замяніць. Але замяніць свой арганізм не зможаце.

Сёння вы думаеце, што будзеце здаровыя заўсёды. Але вы памыляецеся. Уважліва паглядзіце на людзей, якія знаходзяцца побач з вамі. Ці ўсе яны могуць пахваліцца моцным здароўем? Адзін з галоўных паказчыкаў здароўя – працягласць жыцця. Там, дзе няма здароўя, не можа быць і даўгалецця.

Запомніце: неабходна клапаціцца пра сябе і сваё здароўе ўжо сёння!

*Паводле Г.М.Федаровіч*

2. Знайдзі ў тэксце сказ, у якім утрымліваецца галоўная думка тэксту. Падкрэслі ў ім словы, у якіх не супадае колькасць літар і гукаў.

3. Прачытай словазлучэнні з тэксту: дрэннае здароўе, дрэннай паспяховасці, дрэннага настрою.

Ці можна сцвярджаць, што ва ўсіх гэтых словазлучэннях прыметнік стаіць у форме жаночага роду. Выберы адказ і дапоўні яго.

- ***Можна сцвярджаць, таму што***

- ***Нельга сцвярджаць, таму што***

4. Падбяры да слоў антонімы з тэксту. Запішы.

Добрае – _____________, слабым – ____________, маленькае – ________________.

5. Складзі і запішы 3 (тры) пытанні, абапіраючыся на тэкст.

6. Знайдзі ў тэксце сказ, у якім адсутнічаюць дзеясловы. Перабудуй яго так, каб у сказе з'явіўся дзеяслоў. Запішы свой варыянт сказа з дзеясловам.

7. Перакладзі на беларускую мову. Запішы.




